УДК 39

# СМАЧНА ЕСЦІ!
# КУЛІНАРНЫЯ ТРАДЫЦЫІ БЕЛАРУСАЎ: АД ЖЫЦЦЯ ДА ЛІТАРАТУРЫ

**Д.В. Лекуновіч**
Навуковы кіраўнік – **Н.І. Куратнік**, настаўнік беларускай мовы і літаратуры
**ДУА «Гімназія № 2 г. Пінска**

Сёння адчуваецца пільная патрэба пазнання беларусамі саміх сябе праз культурныя і духоўныя здабыткі народа. Разам з мовай, вуснай народнай творчасцю, рамёствамі адметнай рысай кожнай нацыі з'яўляецца і нацыянальная кухня, якая сыходзіць сваімі каранямі ў глыбокую старажытнасць. Адлюстроўваючы штодзённы побыт народа, пісьменнікі не маглі абысці ўвагай і яго кулінарныя традыцыі.

**Мэта** даследчай работы: даследаванне асаблівасцей адлюстравання кулінарных традыцый беларусаў у літаратуры.

Пастаўленая мэта прадугледжвае вырашэнне наступных **задач**:
- знайсці беларускія народныя стравы і сістэматызаваць іх у тэматычныя групы;
- раскрыць характар адлюстравання нацыянальнай кухні ў беларускім фальклоры:
- высветліць, як кулінарныя традыцыі беларусаў паказаны ў паэзіі;
- вызначыць асаблівасці апісання беларускай нацыянальнай кухні ў мастацкай прозе і публіцыстыцы.

**Аб'ект даследавання**: паэтычныя і празаічныя творы, у якіх адлюстраваны беларускія нацыянальныя кулінарныя традыцыі.

**Прадмет даследавання**: асаблівасці адлюстравання беларускай нацыянальнай кухні ў літаратуры.

**Гіпотэза**: творы літаратуры з'яўляюцца адной з крыніц пазнання кулінарных традыцый беларусаў.

Паколькі даследчая работа звязана з літаратурай і этнаграфіяй, мы аналізавалі не кулінарныя кнігі, а энцыклапедыю "Этнаграфія Беларусі", якая дапамагае знайсці адказ на пытанне, якія стравы нацыянальнай кухні выкарыстоўваліся ў традыцыйным побыце беларусаў. Усяго ў згаданым вышэй выданні мы знайшлі назвы 93 страў. Іх мы раздзялілі на групы: першыя стравы, другія стравы, стравы з бульбы, мясныя стравы, мучныя стравы, печыва, напоі, малочныя стравы, дэсерт. Прааналізаваўшы дадзенае выданне, мы прыйшлі да вываду, што беларуская нацыянальная кухня мае багатыя традыцыі, а характар харчавання і ежы беларусаў у многім вызначаліся накіраванасцю іх гаспадаркі. Таму асноўны прынцып беларускай кухні – максімальнае выкарыстанне раслінных прадуктаў пры мінімуме мяса.

У рабоце мы даследавалі нацыянальную кухню праз адлюстраванне яе ў творах літаратуры, і для стварэння больш поўнага ўяўлення вырашылі разгледзець і паэтычныя, і празаічныя творы, а таксама фальклор.

Прааналізаваныя намі фальклорныя творы не вызначаюцца багаццем у адлюстраванні традыцый нацыянальнай кухні. Пры гэтым большай тэматычнай разнастайнасцю характарызуюцца прыказкі і прымаўкі. У загадках, прыказках, казках сустракаюцца традыцыйныя нацыянальныя стравы і прадукты, якія прысутнічалі ў штодзённым рацыёне нашых продкаў: бліны, кулеш, клёцкі, сыр, капуста. Адзначым, што на аснове твораў вуснай народнай творчасці можна зрабіць вывад, што з глыбокай старажытнасці беларусы з вялікай павагай ставіліся да хлеба. І гэта не выпадкова, бо менавіта "хлеб у беларусаў, як і ў іншых земляробчых народаў, здаўна служыў сімвалам жыцця і дабрабыту" [1, с. 513].

Наступным аспектам нашага даследавання было адлюстраванне традыцый нацыянальнай кухні ў паэзіі. На аснове аналізу паэтычных твораў мы прыйшлі да высновы, што ў прааналізаваных намі вершах стравы нацыянальнай кухні згадваюцца рэдка. Акрамя вершаў, мы прааналізавалі ліра-эпічныя творы вялікай формы і высветлілі, што яны вызначаюцца разнастайнасцю ў адлюстраванні кулінарных традыцый беларусаў. Напісаныя ў розныя дзесяцігоддзі XIX і XX стагоддзяў, яны даюць нам магчымасць прасачыць, як мяняліся з цягам часу кулінарныя густы нашых продкаў. У бурлескна-травесційных паэмах "Энеіда навыварат" і "Тарас на Парнасе" на стале ў

багоў традыцыйныя сялянскія стравы: *капуста*, *кулеш*, *каша*, *бліны*, *крупеня* і *жур*. І гэта “адпавядае канцэпцыі бурлескна-травесційнага твора, у якім антычныя багі “пераапрануты” ў сялянскую вопратку і паказаны ва неўласцівых ім умовах простанароднага жыцця і побыту” [2, с. 67].

У плане адлюстравання кулінарных традыцый вялікую цікавасць уяўляе паэма Якуба Коласа “Новая зямля”, у якой аўтар паказвае штодзённы і святочны стол сялянскай сям’і, а таксама застольныя традыцыі, перадаючы “паэзію “гастранамічных” адчуванняў” беларусаў” [3, с. 134]. Не абышлі мы ўвагай і першы беларускі раман у вершах “Родныя дзеці”, які цікавы нам з пункту гледжання захавання беларускіх кулінарных традыцый. У дадзеным творы згадваецца 19 страў нацыянальнай кухні. У кулінарным плане звяртаюць на сябе ўвагу раздзелы “Пашанаванне” і “Гамана ў застоллі”, дзе багаты стол увасабляе гасціннасць гаспадароў і з’яўляецца адзнакай дабрабыту, а таксама сведчаць пра захаванне кулінарных традыцый продкаў. Адчуваецца захапленне аўтара традыцыямі нацыянальнай кухні, якімі “*слаўны ў свеце родны край*”, таму менавіта ім прысвечаны раздзел “Адступленне пятае – кулінарнае“. У ім паэт пяе хвалебную песню беларускаму сталу, згадваючы *“парася па-беларуску”, вяндлінку з водарам ядлоўца, вясковую каўбаску, вантрабянку, бабку, бліны, мачанку-верашчаку і калдуны.* Як бачым, гэта традыцыйныя беларускія стравы, якія і ў канцы мінулага стагоддзя займалі пачэснае месца на стале беларусаў і былі вядомы суседнім народам. Звернем увагу на тое, што тут пераважаюць мясныя стравы, што сведчыць аб росце дабрабыту беларусаў у ХХ стагоддзі, які знайшоў адлюстраванне і ў кулінарных густах.

Сярод празаічных твораў найбольш інфармацыйна насычаным з’яўляецца раздзел “Хлеб і да хлеба” з кнігі нарысаў Уладзіміра Караткевіча “Зямля пад белымі крыламі”, бо ў ім аўтар згадвае, а ў некаторых выпадках і апісвае дзясяткі страў і прадуктаў. Пісьменнік у невялікім па аб’ёме артыкуле здолеў раскрыць адметнасць нацыянальнай кухні і пераканаць чытача у тым, што “*беларус любіць смачна паесці*” [4, с. 398]. Такім чынам ён імкнецца захаваць беларускую кухню як з’яву нацыянальнай культуры, па якой можна меркаваць пра народ, яго звычаі і побыт.

Уяўленне пра стол заможнай шляхты канца XIX стагоддзя, які вызначаўся вытанчанасцю, разнастайнасцю прадуктаў і спецый, дае аповесць Уладзіміра Караткевіча “Дзікае паляванне караля Стаха”. А ў рамане Івана Мележа “Людзі на балоце” стравы, што стаяць на небагатым сялянскім стале, дапаўняюць наша ўяўленне пра сацыяльнае становішча сялян у пачатку ХХ стагоддзя. Неўрадлівыя землі (“пясок ці балото”) не давалі багаты ўраджжай, таму людзі шукалі спосаб “перабіць нішчымніцу” [5, с. 78]. На небагатым штодзённым сялянскім стале *вараная бульба* (*картоплі*), *расол*, *боршч*.

Як відаць з праведзенага даследавання, стравы нацыянальнай кухні заўсёды займалі важнае месца на стале беларусаў, што знайшло сваё адюставанне ў літаратуры, таму сустракаецца даволі вялікая колькасць фальклорных, паэтычных і празаічных твораў, у якіх яны згадваюцца. Такім чынам, можна зрабіць вывад, што выказаная ў пачатку работы гіпотэза пацвердзілася, паколькі літаратурныя творы служаць адной з крыніц пазнання кулінарных традыцый беларусаў.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. – Мн.: БелСЭ, 1989. – 575 с.

2. Беларуская літаратура: вучэбны дапаможнік для 9 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. / В.У. Праскаловіч, В. П. Рагойша, Т. І. Шамякіна – Мінск: Нац. Ін-т адукацыі, 2019. – 286 с.

3. Навуменка, І. Якуб Колас: Духоўны воблік героя / І. Навуменка. – Мн.: Выдавецтва БДУ, 1981. 240 с

4. Караткевіч, У. Збор твораў: У 8 т. Т. 8. Кн. 2. / У.Караткевіч. – Мн.: Маст. Літ., 1991. – 495 с.

5. Мележ, І. “Людзі на балоце”/ І. Мележ. – Мн.: Юнацтва, 1987. – 387 с.